Цэна асобнага нумэру 5 кап

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць проэвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VIII. 31 мая 1913 г. №. 22.

## Новы закон аб школах.

Здаецца, што ўсе сумленные людзі выходзяцца на тым, што найлепей, найлягчэй і найсправядлівей вучыць дзяцей граматы ў тэй мові, якой яны гутаруць дома. Гэта старая праўда і яе давялі ўсе вучоные пэдагогі, ўсе, хто патрапіў ацаніць усю сілу роднаго слова.

Але ёсць людзі, каторые мэтай свaей працы наставілі зніштажэньне слабейшых падўластных ім націй, зніштажэньне мовы гэтых націй і ўсяго таго, чым яны розняцца ад пануючай нації. Такіе людзі ёсць і ў Расеі: гаэта—націоналісты і ўсе правые.

Яны вядуць вайну асабліва проці тых націй, каторые стаяць бліжэй да расейцоў, як іх сваякі. Гэтак правые і націоналісты ваююць перш-на перш з украінцамі і беларусамі, ды найболей руняцца аб тое, каб зніштожыць тую „апратку душы“, якой ёсць родная мова: тады і душу народу лёгка забіць...

Кіруючыся да гэтаго, яны, хаця і гатовы пазволіць усім націям вучыцца у сваіх прыватных школах у роднай мове, беларусам і украінцам такого права даць ня хочуць. З гэтай прычыны колькі дзён таму назад уГасударственным Савеці прылучылося такое здарэньне.

Разбіралі новы закон, каторы ужо прайшоў праз Думу, аб прыватных школах. Паднялася гутарка аб мове, ў якой у тых школах павінны вучыць. Бадай што ўсе—апрача прэдстаўнікоў правіцельства казалі, што ў казённыхъ школах міністэрство можэ завадзіць усюды навуку на расейську; за тое ў школах, каторые аткрывае сам народ, ці прыватные асобы, можна вучыць так як хочуць гаспадары школы. Да гэтаго правые і націоналісты падалі папраўку, каб у законі было ясна сказано, што *па беларуску і па украінську вучыць ні у якіх школах ні пазваляецца.*

Але-ж той праект прыхільнікоў не знайшоў. Усе зразумелі, да чаго кіруюцца правые і націоналісты ды што яны робяць шкоду самой справе навукі дзяцей і пашырэньня прасьветы. Дык *папрауку тую Гасударствены Савет аткінуу.*

Гэта ужо вялікі крок уперод, што ў законі аб прыватных школах *навука па беларуску не забаронена.* Праўда, міністры і начальства школьнае могуць рабіць уселякіе перашкоды пры аткрыцьці беларускіх прыватных школ, як яны цяперь сваімі цыркулярамі—ня гледзячы на высочайшы маніфест 17 апрыля 1905 году аб свабодзі веры-забараняюць беларусам-каталіком вучыцца рэлігіі па беларуску ў роднай мові свaей, Але ёсць надзея, што цяперашні палітычны «курс», каторы кіруецца да абрусеньня беларусоў, урэшці пераменіцца.

Німа ведама толькі і ці новы законъ будзе, зацьверджэн. Пасьля тых перамен, якіе ў некаторых стацьцяхъ зрабіў Савет, яго ўзноў павінна перагледзіць Гас. Дума. Якім ён адтуль выйдзе—хто можэ згадаць?...

А-н а.

## Нашы цэннасьці.

Есць даволі ходкі афорызм, каторы кажэ: „народ жыве датуль пакуль жыве яго мова; без народнай мовы німа народу“. Гэты афорызм, як і многа іншых афорызмоў ў кароткай і меткай форме выказывае якая ёсць найглаўнейшая прымета народнасьці, ці як па заграні чнаму называюць цяпер—*національнасьці.* Аднакжэ афорызм гэты не абнімае усіх тых цэннасьцей, каторые разам твораць народнасць — націю з нейкай этнічнай группы. Даўней, бліэка да дэевятнадцатаго сталецьця не было саўсім національного пытаньня. Національнасць злучалі з гасударственнасьцю і цэрквай, як гэта і цяпер робяць ешчэ цёмные людзі. Развіцьце національного пытаньня прыпадае на XIX сталецьце, а навучная разработка яго на канец XIX сталецьця і на нашы часы. У апрацаваньні гэтаго, вынесеннаго самім жыцьцём, у меру развіцьця дэмократызму, пытаньня, вялікую заслугу палажылі такіе вучоные, як Спэнцэр, Тайлёр, Каўтскі, Бокль, а апошнімі часамі Вэрнэр-Зомбарт і іншые перворазрадные навуковые Эўропэйскіе сілы. І вось паводле найнавейшай навукі національные цэннасьці бываюць дваякіе: матэрьяльные і моральные. Матэрьяльные цэннасьці гэта: гасударственнасць, войска, выпаўніцельные органы і іншые прыналежнасьці гасударственнай ўласьці. Матэрьяльные національные цэннасьці могуць мець толькі гасударственные націі і недаступны націям не гасударственным. Але жыцьцё паказывае нам, што націі німаючые свaей гасударственнасьці могуць трымацца цэлые тысячэлецьця і проціў стаяць найдаўжэйшаму нават дэнаціоналізуючаму ўплыву другіх, суседніх, сільнейшых с кожнаго боку націі. Такіе націі вытрымываюць пастаронны націск і пераносяць цэла доўгалетні гнёт, апіраючыся на *моральные* національные цэннасьці. Моральные національные цэннасьці у свой чарод бываюць дваякіе: інстытуціонные і ідэальные. Інстытуціонные цэннасьці складаюцца с суммы моральных інстытуцій і организаціонных форм, каторые распадаюцца на чатыры вялікіе атдзелы: мову (якая абыймае і літэратуру—слова і славеснасць), цэркву, пачуцьце національной еднасьці і абычаёў. Ідэальные цэннасьці — гэта: гісторыя, традыція, ідэалы. Налічнасць ўсіх гэтых цэннасьцей творыць моцную націю, нават без матэрьяльных цэннасьцей, значэ без гасударственнай организаціі. Нація, каторая мае налічнасць інстытуціонных цэннасьцей можэ жыць і развівацца у чужой національна гасударственнасьці без національного для сябе ушчэрбку, пры варунку што гасударственная чужая организація ня будзе кіравацца да дэнаціоналізаціі паднявольнай сабе націі, а нават і пры налічнасьці такога кірунку, так званая інстытуціонная нація, можэ бязшкодна для сябе вынасіць барадзьбу і нават шкоды з навязкай аплачываць сабе разростам ідэальных цэннасьцей.

Другая саўсім справа з націямі, каторые маюць толькі ў меншай, або большай часьці інстытуціонные цэннасьці, такіе націі пастолькі толькі могуць утрымацца пры жыцьці, паскольку недахват інстытуціонных цэннасьцей запаўняецца сільными цэннасьцямі ідэальнымі: маюць сваю гісторыю, національные традіціі і крэпкіе, шырокіе ідэалы.

Гэтулькі можна выснаваць с цяперэшняй навукі аб національнасьці. Пераходзячы да найбліжэйшаго і найболей цікавячаго нас беларускаго пытаньня насамперш пастараемся разгледзіць якіе мы маем національные цэннасьці і якіе маем шансы называцца націей.

Найперш *матэрьяльные* цэннасьці —іх у нас німа, але навука кажэ,

## АЛЕГАНТ.

### I.

У вёсцы Воўчылапы жыла дужа бедная удава Аўдуля. У яе было трое дзяцей: дзьве дачкі, Тадора і Парася, каторые ужо хадзілі на заработак і памагалі матцы, ды хлопец Сьцепан, які меў ужо сёмы год жыцьця і да работы ня быў дужа ахвотны ані здатны. Любіўбы ён хараша адзевацца, але ў хаці гэтых убороў якраз недаставала.

Хадзіў Сьцепан у аднэй зрэбнай кашулі, да пят, а Аўдуля пакуль што ані думала аб другой якой апратцы для сына.

— Калі ты мне мама купіш капялюш?—пытаўся хлопец.

— Які ты алегант!—сказала матка.—Збытнік нейкі, табе капялюш у галаве, а я во думаю, каб як небудзь купіць сьвінку... Каб было с цябе што добраго, то бы ты сам сабе капялюш змайстраваў.

Нядоўга пасьля гэтаго купіла Аўдуля сьвінку і гаворэ да сына:

— Пілнуй гэтаго парасяці, як вока ў галаве, бо гэта увесь наш дабытак.

Сьцепан выганяў што дзень сьвінку на поле: ад другіх пастушкоў навучыўся рабіць пляцёнкі с саломы, а пасьля сам сабе змайстраваў капялюш.

— Мама,—кажэ раз ізноў да маткі.—купіця мне чырвоную жычку да капялюша!

— Сьцепан, ня будзь ты гэткі дурны! Я табе лепей-бы справіла штанёнкі, заместа жычкі; чэкаю толькі: пакуль Тадора лепей падзярэ свой андарак, то табе з яго нашыю дастатные штанёнкі.

Хлопец нічога не атказаў, але праз нейкі час ізноў кажэ матцы:

— Магла-б мне, мама, затое што пасу сьвінку, купіць дзягу с цыганком, с красівом і калітой.

— Гэта-ж бы мяне сам Бог пакараў за гэта: у хаці найпатрабнейшаго німа, а каб я апошняе атдавала на тваю аліганцію, сказала Аўдуля.

Прышла зіма. Хлопец сьвінкі не пасьвіў, толькі пасінеўшы ад холаду, з мокрым носам, сядзеў на пяколку і прыбіраў капялюш у пятуховы перья.

— Калі-ж ты, Тадора, падзярэш гэты андарак?—Дапытываў Сьцепан у сястры.

— Ен ужо саўсім падзерты, але мама ані думае новы справуляць...

Узяліся цяпер за матку абоя і як пачалі яе журыць, то ў канцы Аудуля атдала Тадоры сваю старую спадніцу, а с Тадорынай пачала шыць нагавіцы для Сьцепана.

— Мамачка, зрабі мне кішані!—прасіў хлапец.

— Аткасьніся, алігант ты! Якраз, буду табе кішані рабіць. Як трэба будзе што схаваць, то можэш за пазуху.

Зышло не мала часу каля шыцьця гэтых нагавіц, бо матка павінна была штукаваць, лятаць. Хлапец ня меў цярплівасьці і дакучаў матцы, што шыцьцё ня спорна ідзе. Аўдуля умысьле так марудзіла, каб Сьцепану даць новые нагавіцы перад самымі Калядамі: кажуць, што будуць доўга насіцца.

Прыйшла куцьця: матка яму дае нагавіцы і кажэ:

— Маеш, і шануй, бо ня скора на другіе такіе узбудешся! Гэта дастатные, на выраст, як на чэлавека, ні на такого рака..,

Падзякаваў матцы і зара надзеў першые ў сваім жыцьці нагавіцы; у візе пазакручываў шнуркамі, як сталы мужчына: дужа яму гэта подабалося, бо думаў, што гэтак «парадней» будзе.

На двaрэ гэтаго дня быў вялікі мароз; але хлапец, хацеў, каб яго людзі у вёсцы бачылі, то надзеў на галаву капялюш с пятуховым пяром і ў сваіх новых нагавіцах, прабег праз усю вёску. Пасля вярнуўшыся дамоў, зняў штанішкі, злажыў іх, палажыў на іх капелюш, усеўся узноў на пяколку і глядзеў на гэта, як на што святое.

— От, каб я ешчэ меў дзягу, а да гэтаго ножык - цыганок!—гаварыў да сястры.

—Чамуж прыдалася-б сказала Тадора, — але гэтаго ніхто матцы ні ўгаворэ.

Мінула зіма. Хоць весна ужо зачалася, але ешчэ было сцюдзёна. Сьцепан павінен быў ганяць сьвінку на поле, бо і ўсе людзі дабытак свой павыганялі. Аднаго разу Сьцепан прыбег у хату на палудзень, быў ссінеўшы ўвесь і ляскаў зубамі.

— Мама, мама!—крычыць,—у гэткай апратцы, як мая нельга вытрываць, вецер безмала духу мне ня высьвістаў.

Матка пачала журыць яго:

Мерзьляк, гніляк! Можа пярыну буду за табой насіць? Ня можэш, як другіе, лётаць па полю, каб разагрэцца?

Але пачэкаўшы зняла с сябе ватоўку безрукаўную і дала яе хлопцу, каб апрануўся. На дожджу і на сонцы праз лета паліняла ватоўка і пад восень пашыла яму матка з яе кабат; але нестававала на рукавы, то яму выштуковала рукавы са старой чырвонай шнуроўкі Тадоры.

Ізноў раз адзываецца Сьцепан у хаці:

— Дужа-б мне хацелося мець шпільку пры кашулі... Гэтак добра, як блішчыць пад барадой.

— Пляці, пляці,—кажэ матка,—будзеш на сваім, то тагды купіш, а цяпер абойдзешся і бяз гэтай аліганціі,

Цэлые два гады насіў хлапец штанёнкі с Тадорынаго андараку, а пасьля яны так разляцеліся што матка ўжо не магла сабраць іх і павінна была пашыць другіе.

Сьцепан у канцы пачаў хадзіць на заработкі. Раз у сьвята пайшоў на кірмаш і ўвесь час аглядаўся, якіе хто мае боты на нагах. Думаў сабе аб тым, што і ён будзе хадзіць некалі у

што бяз іх нацiя можэ жыць і развівацца. Значэ цэннасьць да жыцьця нацii не канечна патрэбная.

*Моральные цэннасьці.* — *Інстытуцiонные*: I. мова; мову мы маем, мова наша жыве, гэта адна с цэннасьцей без каторых нацiя ня можэ жыць.—Мы яе маем. II. Пачуцьце нацiональнай еднасьцi творыцца праз мову; пачуцьце такое сярод шырокiх мас беларускіх, нават найцямнейшых ёсць. III. Абычаі. Пад абычаямі разумецца уклад жыцьця, грамадзянскiе формы і інш. Гэта так сама мы маем. IV Цэрква. Цэрквы нацiональнай мы не маем, але і цэрква хоць патрэбна для паўнаты нацiональных цэннасьцей, адначэ без яе можэ нацiя жыць. Прыклад маем на нацiях, каторые нацiональнай цэрквы нi маюць. Нацiональная цэрква гэта важнейшая справа для гасударственнасьцi, чым для нацiональнасьцi.

С перачысьленнаго вышэй відаць, што мы беларусы с чатырох інстытуцiонных нацiональных цэннасьцей маем тры найважнейшые і не дахват нам апошняй - цэрквы.

Далей, якже у нас справа стаiць з *iдэальными* цэннасьцямі? I. Гiсторыя. Цi мы маем сваю гiсторыю? —Маем. Была нават беларуская гасударственнасць. II. *Нацiональные традыцii*;—маем, хоць.. слабые, не дзеля таго, што іх не было, але дзеля таго, што яны не захавалiся праз утрату нашай буржуазii і мешчанства. III. *Iдэалы*. Есць; агульналюдзкiе — демократычные і нацiональные, без каторых, разумецца, не было-б гутаркi аб адраджэньнi нашым, як нацii.

З гэтаго iзноў перагляду відаць, што мы маем: гiсторыю, слабые традыцii і, так сказаць, зародышы iдэалоў. Зародышы таму, што мы агульна людзкiе iдэалы куём не ў сваей нацiональнай кузьнi, а пераўмаем іх ужо ператворэнымi, перэжаванымi, падсоленымi і падперчаэнымы гiсторыей, традыцiямi і кiрункамi мысьлi нашых старокультурных суседзеў. Такiе iдэалы, нават найшырэйшые, найбольш людзкiе (гуманiтарные) не маюць аднача прыцягаючай сiлы,

І выходзiць, што мы маем цела (народ з iнстытуцiоннымi нацiональнымi цэннасьцямi), але гэтае цела каб ажывiць патрэбен жывы дух, патрэбны iдеалы поўнацэнные ўсесьветные прапушчэные праз нашу нацiональную прызму. Каб заваеваць мейсцо ў агульна людзкай культуры, мы павiнны ня толькi браць з агульна—людзкой скарбнiцы, але і класьцi ў яе роўнацэннае. Або прасьцей кажучы, калi мы хочэм жыць і быць нацiей, народам, мы павiнны стварыць сваю лiтэратуру, навуку, сваё штукарства. Вось глаўны варунак бытаваньня нас, беларусоў, як нацii.

Лiшнi.

## Цi-ткi мы запраўды цямней за усiх.

Чытаў, чытаў я розные нападкi на беларускую цемнату і ня вытрываў, каб не агрызнуцца. Мусi у нас ужо у моду увайшло безперэстанку жалiцца на нашу цемнату, бо як толькi пачнеш перэглядаць карэспандэнцii з розных закуткоў нашай бацькоўшчыны, то якраз і уткнешся у гэтае паганае слова «цемната». І што найгорэй, што нашы беларусы селяне гатовы і ўзапраўды паверыць, што яны найцямнейшые людзi пад сонцам, а гэта ўжо саўсiм дрэнь справа, бо чэлавек раз утрацiць веру ў самога сябе робiцца да нiчога нездатным. Ды і папраўдзi сказаўшы цемната наша не такая ужо цёмная, як яе iншые ахвочы малеваць. Праўда, што мы ва ўсiм далёка ззаду асталiся за такiмi-ж самымi селянамi, як і мы, але немцамi, англiйцамi, чэхамi і інш. але і нашаж iнтэлiгенцiя, ня тут кажучы, далёка ешчэ не зраўнялася з заходна эўропэйскай iнтэлiгенцiей, і то кажучы аб агульнай краявой iнтэлiгенцii, змешаўшы у адно і польскую і расейскую. Дык і выходзiць, што iнтэлiгенцii нашай нiма што тыкаць селянiна цемнатой, калi яна сама не надта што сьвятлейшая. Другое вось што: атсталi мы ад заходна—эўпэйскаго селянiна у нашай граматнасьцi, у зямельнай культуры. Але цi былi-ж у нас беларусоў свае беларускiе школы, як у нямецкаго і францускаго селянiна. Кажуць папярэдзiлi нас латышы, палякi, лiтоўцы, а цi латышы не маюць сваiх народных школ, цi палякоў у польшчы у школах ня вучаць па польску, цi лiтовец пачаткi вучыцца у чужой мове, гэтак-як мы? Не. Ну дык і ясна прычына чаму мы адсталi. Чужая пачатковая школа навучае нас чытаць, але не назвiвае нашей душы, розуму, не развiвае дзеля таго, што яна—чужая. Нiхай у нас пачатковые школы для селян будуць па беларуску і вы не агледзiцеся калi наш селянiн зраўняецца з латышом, палякам, лiтоўцам, а можэ пры сваей прыроднай кемнасьцi і далёка iх папярэдзiць. Бо што наш народ кемны вiдаць ужо с таго, што як у палякоў, так у расейцоў у чысьле перварадных культурных сiл чысьляцца людзi узгадаваные на нашым загоне. Нiма што казаць, наша нiўка на слаўных людзей урадлiва, толькi беда у тым, што дагэтуль ураджай гэтые збiралi і спажывалi ня мы. а тые, каторые цяпер як раз вытыкаюць нам нашу цемнату.

Есць такiе, што папярэдзiлi нас, але ёсць і такiе, што далёка такi за намi асталiся ззаду. Узяць хоцьбы тых самых палякоў, хоць у iх гаспадарка куды лепей пастаўлена але наш селянiн у агульным развiцьцi вышэй ставiць ад польскаго селянiна, беларус ад яго і развiцьнейшы і хiтрэйшы і нават працавiцейшы. Вялiкорос астаўся далёка з заду за беларусам па гаспадарцы. Беларус—гэта бытцым немец перад вялiкаросам. Вось прыклад: мы сядзiм на жвiрках і на пясочках, а у нас голаду не бывае, а ў Вялiкарассi амаль ня з году ў год голад, хоць сядзяць на чарназёмi. У нас незавiдна гаспадарць на зямлi, калi прыраўняць да загравiчнiкоў, а ў Вялiкарасеi і з рук вон iхня гаспадарка.

У нас ёсць пьяніцы, але усёж такi цьвярозых гаспадароў болей, а ў Вялiкарасеi болей пьянiць, як цьвярозых, а што да цемнаты агульнай, то там народ куды цямнейшы, грубейшы і больш лянiвы.

Дык вось, дармо такi лаюць нашаго селянiна за цемнату. беларус далёка ня цёмны ешчэ, а пры сваiм спакойным і разважным характэры, пры сваей працавiтасьцi можэ хутка стануць памiж першымi народамi. Тым каторые ахвочы нарэкаць я-б раiў лепей менш нарэкаць, а ўзяцца за працу і шырыць асьвету памiж сваiх братоў, дабiвацца правоў для сваей нацii і гэткiм парадкам ратаваць людзей ад цемнаты, а ня тое, што напiсаў карэспандэнцiю у газэту аб вясковай цемнаце і на тым супакоiўся, бытцым зрабiўшы важную работу.

Iншая ёсць прычына, што нашаго селянiна не паважаюць, гэта тое, што ён бедзен. „На беднаго Макара і шышкi валюцца"—гэтак і з намi беларусамi усякi нападае на нашу цемнату затое, што мы слабы, бедны. Нябось, як беларус пабагацее, то той самы чэлавек робiцца ня тым. Вось-жэ прычына тэй нiбыто цемнаты крыецца у беднасьцi. Нарэканьнем бяды не прагонiш, можна яе пазбыцца толькi працай і то як можна шырэйшай хаўруснай працай, за гэта і павiнны узяцца, заместа пустога нарэканьня, усе тые каму коле у вочы наша, як яму здаецца, цемната.

*Юры Вирэшчака.*

## Пажарные дружыны.

Як толькi надходзiць, лета з усiх канцоў нашай Беларусi лятуць вестки аб пажарах. Там згарэла вёска, там мястэчка, там цёплые, там халодные будынiны; усе газэты поўны гэткiх вестак, на кожным кiрмашы iх пачуеш і блiзка што дзень убачыш у ночы на небасклоне зарнiцу. Вёскi нашы і мястэчкi гараць што-году, што году iдзе з дымам многа людзкой працы і поту і людзi глядзяць на гэта спакойна, глядзяць злажыўшы рукi, чэкаючы, як вол даўбнi; сваей чэрады на пажар.

Пара схамянуцца, браты селяне, пара пачаць нам думаць аб тым, каб агонь ня знiшчыў нам дабра нашаго, нашай працы. Ад пажароў можна і трэба баранiцца, а каб умець баранiцца ад гэтаго нешчасьця, каторае, найчасьцей цiшком, як злодзей прыходзiць, трэба быць заўсёды нагатовi. Па нашых вёсках гэтулькi ёсць маладзежы, хлопцоў як дубкоў, здатных да ўсякай работы, кемных да кожвай справы. У буднi дзень, праўда, яны усе заняты, той дома, той у полi, але перэд сьвятам, ды сьвятам маркоцяцца нашы хлопцы, што нiма нiякай занятки і з гэтаго безгалоўя адны пушчаюцца на рожные штукi, другiе бяруцца за чарку, а ад чаркi да палкi дужа ўжо нiдалёчка... А вось, каб заместа чаркi, палкi і пустой траты часу па вёсках дзяцюкi ды злажылi пажарную дружыну. Есць-жэ па вёсках нiмала людзей, развiтных і бывалых, каторые бачылi сьвету, служылi салдатамi, тых можна выбраць за пажарных стараст, як навыкшых да каманды і вiхайбы што тыдзень га-

ботах. Як толькi варнуўся с кiрмашу то і пытае маткi:

— Цi ня ведаеш, мама, што могуць каштаваць боты?

— Усяк каштуюць, як якiе боты. Але галавы сабе не ламай дармо: хлеба у хацi многа трэба і грошы на боты нiма. Абойдзешся смакам.

II.

Прыйшоу у канцы той час, што Сьцепан за свае грошы мог сабе купiць новые боты. У палiняўшым кабаце с чырвонымi рукавамi, саламянным капялюшу і дзiравых нагавiцах дажыў Сьцепан шаснадцатаго году жыцьця і пайшоў да людзей на службу.

— Мне дужа хочэцца ботаў! — казаў ён не раз да свайго прыяцеля, Антося, каторы ужо ад двох гадоў хадзiў па службе і меў алiганцкiе боты.

— Толькi памятай, чэлавечэ, на боты грошы не шкадуй! Заплацi многа, а купi што добрага,—раiў Антось.

Сьцепан служыў, заслуг сваiх у гаспадара не браў, толькi чэкаў, пакуль назбiраецца у гаспадара павiнных яму грошы, каб стала на добрые боты. Неяк пад восень, каля сьватога Мiколы кажэ ён да Антося:

— Антось, папрасiся ты у свайго гаспадара і пойдзем са мной заўтра у мястэчка, купляць боты.

— А добра,—адказаў Антось.

На заўтрае пайшлi абодвы на кiрмаш у мястэчка. Ботаў там было гэтулькi, што вокам ня зьмерыць. Глядзяць, ажно ёсць боты с кароценькiмi халевамi.

— Гэта старасьвецкая мода,—кажэ Антось,—у такiх цяпер ня ходзяць. Абсацы павiнны быць высокiе, васкаваные, халявы даўгiе, а пры iх вушы з добрай тасьмы... Ну і глянс якi-такi мець павiнны.

Iдуць далей, аж тут iзноў на доўгай жэрдцы вiсiць цэлы рад ботаў.

— Хоцэс пан боты? Боты, боты!.. Шытые, штыфтаваные?!—крычаў жыд крамар.

Сьцепан аж зачырванеўся, бо яго першы раз у жыцьцi «панам» назвалi. Усё стрэляў вачыма то па адных, то—па другiх ботах.

— Купляйця, купляйця. Боты юхта, гамбурскiе, купляйця!!!

Сьцепан зусiм асалавеў, разiнуў губу, вытарашчыў вочы; здавалося яму, што кожды бот нешта да яго прагаварывае, як жывы чэлавек. Уляпiў вочы у пару ботоў на высокiх абсацах, а скура на халявах была у дробные клетачкi. Ужо, ужо хацеў спытаць цану, як трохi далей убачыў ешчэ харашэйшые боты, як з зялеза вылiтые; вушы у iх былi з зялёнай тасьмы, а абсацы высокiе, падбiтые падкоўкамi.

Падыйшоў да крамнiка і нясьмела пытае цану.

— Ого-го! гэты пан ведае чаго шукаць! Гэта ўжо што боты, то боты!—угаварывае крамар. — Есць чым зямлю прытаптаць. Магу сказаць сьмела: не атдам iначэй, як за дзевяць рублёў, але бачу што панiч знаешся, а такому я заўсёды таньней прадаю.

Пасьля узяў боты і стаў iх каля наса вярцець. Аглядаў і Антось, пробаваў у руках скуру, цi крэпкая, панюхаў, прымерыў да нагi і кажэ:

— Мне здаецца—гэтые боцiкi добрые, толькi трэба добра старгаваць.

Сьцепан узяў адвёў Антося на бок і кажэ яму на вуха:—Як гэтых ботаў я не куплю, то нiхачу iнакшых мець, буду лепей босы хадзiць.

Тагды пачалiся таргi; таргавалiся доўга, заўзята, да зьмерканьня. Крамвiк цьвёрда трымаўся цаны, а сябры дзесяць разоў атходзiлi і дзесяць разоў варочалiся; добра ўжо сцямнела калi торг кончылi. Сьцепан атдаў за боты болей як поўгадавую сваю заслугу. Варочалiся цяпер дамоў. Балота было вялiкае, але Сьцепан ботоў не абуў, толькi iх нёс пад пахай. Як ужо паварачывалiся у сваю вёску Антось сказаў:

— Вiдзiш, Сьцепан, я сцёр цэлы дзень дзеля тваiх ботаў; гаспадар мяне за гэта не пахвалiць; утамiўся, вагаварыўся... то першые боты павiнен ты, братка, аблiць... Пойдзем у карчму!

Ведаў аб гэтым Сьцепан, што сябру свайму павiнен гэту ласку выплацiць; але усе грошы, што да капейкi, пайшлi на боты і, як кажуць, зламанаго грашака ня меў пры душы...

— Наш шынкар табе паверыць—сказаў да збедаванаго Сьцепана Антось. — Знаюць мяне у карчме... А то дужа я здарожэны і галодны; трэба выпiць гарэлкi і перакусiць што небудзь.

— Сьцепан ешчэ вiколi ня пiў гарэлкi, бо заўсёды чуў ад людзей, што ня гожэ хадзiць пiць у карчму. Але. калi Антось крануў яго гонар, што трэба новые боты аблiць, то павiнен быў прыстаць на гэта. І ён сам быў крэпка здарожэны і галодны. Шынкар быў адыным чэлавекам на сьвецi, каторы мог даць яму на павер. Калi яны увайшлi у карчму і папрасiлi гарэлкi і закускi на павер, шынкар, крыху падумаўшы, паставiў перад iмi дзьве вялiкiе чаркi гарэлкi. Кожды узяўся за сваю і выпiлi. Антось закусываў пiрагом, а Сьцепан адразу пачуў, што яму у галаве нешта муцiцца. Дайшоў да лавы, паставiў каля сябе боты, схапiўся за галаву і пачаў крычэць:

— Ой, Божэнька!—сьвету канец, цi што такога?! Усё са мной круцiцца, ляцiць дагары нагамi... Боты, боты! трымайця людзi!..

— Ня дзiва,—сказаў Антось—хлапец галодны і не навыкшы, то адна чарка гэткага з ног звалiць.

— Мае ешчэ часу, то уложыцца. — Атказаў карчмар.

А Сьцепан як сеў на лавi, то ўжо з мейсца ня мог крануцца. Антось зьеў сваё, выцер губу і кажэ да яго:

— Сьцепан, зьбiраймося дамоў!—Але Сьцепан анi думаў уставаць.

— Не турбуй яго,—адазваўся шынкар.—Нiхай трохi здрэмне, працьярозiцца. Карчма да

### Што чувац каля Валожына Ашм. п.

Гэтымі днямі каля нас было некалькі нешчасьлівых здарэньнеў. У вёсцы Жураўцох налажыў на сябе рукі адзін малады чэлавек; ён пагнаўся на пасаг, ажаніўся у мясаедзе, бо яму цесць абецаў дзьве дзе яціны зямлі пасагу, Тымчасам, як у нас кажуць: „абецанка — цацанка, а дурному радасць" — гэтак было і тут: жонку ён дастаў неўдалую, с таей зямлёй парадку йшчэ не было, а тут, як на злосць, маладеж у вочы лезець, дык ён налізаўшыся у Валожыні парадна манапалькі, прыйшоў дамоў насыпаў поўрукі пораху, шроту і на верх кулю у стрэльбу, выйшоў за гумно і ўляпіў сабе у грудзі.

А ў вёсцы Замасьцянах быў вялікі пажар, згарэло 22 хаты з усімі будынкамі і хоць вёска Замасьцяны ляжыць на самым бэрэзі ракі Бярозы, але у гэту суш, ды пры такой гушчы будынкоў, як у нас цяпер, пры гэтай праклятай шнуравой гаспадарцы, ня можна было даць ніякаго ратунку і агонь тагды толькі уняўся, як прыпёрся да прагонкі. А ешче як на бяду мужчын не было дома, бо цяпер у нас правяць дарогі, дык усіх гоняць на дорогу. Да агню кінуліся усе хто толькі мог, адны ратаваць а другіе для цікавасьці, от як гэта і заўсёгды пры пажарах у нас. Дык гэтак сама і з вёскі Кражына ўзялі людзі перэбірацца на чаўнох праз раку да пажару і ў адзін човен села трое дзеўчат і адзін хлапец, але чаўнок быў ня вялікі, ня мог утрымаць на вадзе усяго цізкару і пачаў сёрбаць ваду, а ў палавіне ракі пачаў тонуць. Пачуўся крык і лямант і пакуль дасьпелі іх ратаваць, дык хлапец выплыў, двох дзеўчат выратавалі, а трэцяю 19 гадоў дзяўчыну дасталі ужо нежывую! Трудна апісаць горэ бедных пагарэльцоў і горэ нешчасьлівых бацькоў дзяўчыны! Зразумеець гэта кожны селянін што значыць бацьком свая дачка рабстніца! Браты Беларусы! кідаймо старые парадкі, а пераходзьмо жывей на хутары; будзе менш нешчасьцёў, а карысьці многа.

*Стары Улас.*

---

## Мінск.

### Чорнасоценная каша.

Верхавод брацкіх арганізацій у мінскай епархіі, пераплётчык Некрасов, ён-жэ і друкар, адмовіўся, як мы ўжо ведаем друкаваць Саланевічоўскую «С. З. Ж.». Аб гэтым зара паведамілі еп. Мітрофана, с прыдаткам, што наёмны патрыот Саланевіч за кароткі час, які прабыў у Мінску атрымаў с Пецярбургу 3 разы па 1500 рублёў, якіе грошы прапусьціў вясёлым спосабам. Даведаўшыся аб гэтым еп. Мітрофан рэзка адмовіўся памагаць Солоневічу грашамі і даўшы грошы Некрасаву выправіў яго у Пецярбург у «Усерасейскі Нацыянальны Клуб», каб перэхапіць Салоневічоўскую субсыдію.

Некрасов выехаў з рэкомэндуючымі пісьмамі вядомаго пярэхрэста Мэндэля Шофэра, нідаўна аткінутаго мінскімі націоналістамі, а цяпер пасьля доўгай падарожы па Пецярбургу і Варшаве, вянуўшагося у Мінск дзеля пасеву духоўна-паліцэйскаго національізму.

Акуратна, як кажуць, нагаладаўшыся, Шофэр падсеў да Некрасова, навучыўшы яго пусьціць пыл у вочы еп. Мітрофану, обшэльмаваўшы «патрыотычные подвігі» Солоневіча з мэтай пусьціць сваю шофэроўска - некрасоўскую газэту „Минское Русское Слово".

Стаўпы духавенства і національізму круцяць неяк носам, на прыхільнае аднашэньне ўладыкі да шофэроўскай мэхавікі, памятаючы, што той-жэ еп. Мітрофан многа патрудзіўся ў сваім часе над тым, каб прагнаць Шоффэра, за збэнтэжэньне газэтных грошы ў часы верхавода Скрынчэнкі.

Памятаючы, што Шофэроўскі націоналізм, паваротная хваля катораго цешыць толькі адну паліцію і адміністрацію, была прычынай утраты багатай мінскай кафедры праз еп. Іоана і перамяшчэньню яго з Одэссы у Таганрог.

Солоневіч, баючыся шофэроўскай хвалі, пасьпешна мобілізуе свае сілы, разлічаючы на падтрыманьне часьці духавенства і тых націоналістоў, каторые ня хочуць злучацца с паліцэйскімі патрыотамі, сярдітымі на Солоневіча за тое, што ён іх лаяў у сваей газэці і не злучаўся з імі.

Ведама з двох ліх—«Солоневічеўшчыны» і «Шофэроўшчыны» першая на адзін волас будзе усё-ж такі чысьцейшая, як не апіраючаяся на паліцэйскую ўласць і сыск.

І дзеля гэтаго не цяжка угадаць хто каго пераможэ пры ўзаемным зрываньню масак, што пачнецца як толькі выйдзе Шофэроўская газэта.

### Пэтыція пачтовых чыноунікоу.

Чыноўнікі мінскаго раз'езднаго пачтамта (VI атдзел перавозкі почты па зялезных дарог.) на тым тыдні падалі на імя Гас. Думы пэтыцію аб палепшэньні быту і матэрьяльнаго палажэнія вялікай арміі раз'ездных чыноўнікоў.

Здаецца што тут крыўднаго мейсцоваму начальству?!.

Тым часам начальнік VI атдзелу, даведаўшыся з газэт аб пэтыціі, зара зрабіў дазнаньне сярод падўластных, аб тым хто іх падбіў на гэта. Усе, як адзін атказалі, што ня ведаем.

Інспэктар почт і тэлеграфоў даў тэлеграму з Варшавы аб маючэйся быць рэвізіі. VI атдзелу. Чаму гэта з аднаго, маўляў, VI атдзелу паступіла пэтыція, ды ешчэ кадэцкаму дэпутату, нарабіўшая гоману і ў Думе і па ўсей Расеі.

У праўленьні VI атдзелу цяпер страшэнны перэпалох.

### Пажар.

У вёсцы Грыцкавічы, Барысоўск. пав. узняўся пажар, каторы змёў каля 150 будоўлёў. Пагарэло ўсё, увесь дабытак, людзі асталіся без куска хлеба пад голым небам.

### Нелегальная літэратура.

У вёсцы Тумілавічах у пуні селян Паўлоўскіхураднік выкрыў многа нелегальнай літэратуры. Паўлоўскіх арэштавалі.

### Мост заламауся.

У мястэчку Івенцы, Мінск. пав. было такое здарэньне: Колькі дзён таму назад пашла каталіцкая працэсія, а так як быў гэта кірмашовы дзень, то народу сабралося дужа многа і вось калі пераходзілі праз мост, перакінуты праз рэчку Волму, мост ня вытрымаў ціжару і рынуў, а разам з ім і уся працэсія Дзякуючы таму, што ў тым мейсцы пад мастом была мельнічная скрынка да вады на калясо, усе збавіліся адным толькі перэпалохам.

### Ешчэ пажар.

У вёсцы Мікулічах Бабруйскаго пав. згарэла 40 селянскіх хат, цэрква і згарэло адно дзяцё.

### Аткрыцьце помніка.

На брыляўскім полі, 15 вёрст ад Барысава, каля ракі Бярэзані 15 мая аткрылі помнік па тым войску, каторае пало пад час вайны с французамі у 1812 гаду. На гэту цэрамонію прыехаў губэрнатар з Мінска і віцэ-губэрнатар; з Вільні прыехаў камандуючый вайскамі віленскаго округа і было многа іншых ваенных чыноў. Было і селян з акалічных вёсак, а найбольш баб, бо думалі што будуць даваць дармовую гарэлку, але гэтаго не было. Толькі начальство па атправе малебна зрабіло «чыстку» бутэлькам. Па абедзі загадалі палкавой музыцы зайграць польку, а селянскім дзеўчатам танцаваць, але штось танцы ня клеіліся: дзеўчаты цяперэшніе не надта ўжо умелі забаўляць паноў. Адна дзеўчына дала салдату падзержаць вялікую хустку пакуль патанцуе, але браць назад хусткі не прышлося, бо не было ні салдата, ні хусткі.

*Ш—т.*

---

## Гродна.

### Пажары.

14 мая 1913 году у вёсцы Берэставічанах, гродзенскай губ. і пав. быў страшэнны пажар. Згарэла 25 хат, 30 гумен і 40 розных іншых будынін. Загарэлася вёска у першай гадзіне па пелудні, ад паравіна. У Берэставічанах ёсць пусткі графа Косаковскаго. Граф Косаковскій меў у Берэстовічанах стадолу і адрыну, катоуые стаялі бок а бок с селянскімі будынкамі. Гэтые пусткі арэндуе жыд, каторы толькі цяпер згадзіў суседняго памешчыка Колупайлу вымалаціц яму збожжэ. Дык гэта Колупайлоў машыніста,—ён служыць разам с тым і вучнём кавалю, як пусьціў на рызачку паравік, то з яго аж іскры па стрэсе пасыпалася. Насохшая стрэха момэнтальна загарэлася. Ад графскай стадолы, пажар, як зьвер шалёны, захватываў адзін за другім селянскіе будынкі. Многа гаспадароў нэ было дома і яны вярнуўшыся с поля, ці з мястечка на мейсцы сваіх хат знайшлі толькі курэўшые галавешкі і гурбы попелу. Пазбераўшыеся на пожар людзі с суседных вёсак памагалі нешчасным выносіць скарб. А як прышлося тушыць пажар, то нічога ня можна было парадзіць з огнём голымі рукамі, на ўсей вёсцы не знайшлося ні аднаго пажарнаго струмэнту: ні сікаўкі, ні бочкі, ні бусака; ні пад аднэй хатай не было мяцёлкі, ні кадушкі з вадой. Толькі цераз гадзін дзьве, як зняўся пажар, явіліся ураднік і старшына са струментамі. Хіба і у гэтаго старшыні на пажарных бочках сядзелі куры, а сікаўкай налівалі капусту, што ён ня мог прыбыць на пажар раней.

*Пагарэлец.*

---

## З усіх старон.

### Два мільены рублёу для Монголіі.

Расейскае правіцельства пазычыло мангольскаму 2 мільёны рублёў безпрацэнтна, на арганізацію адміністрації у Монголії. Для кантролі расходаваньня манголамі гэтых грошы будзе назначэн асобны чыноўнік ад Расеі.

### Рэформа паліціі.

Маклакоў прыгатаваў праект рэформы паліціі. Паводле гэтаго праекту жандармэрыя астаецца спаўняць тые самые павінвасьці што і дагэтуль, астаюцца ў сіле „ісключыцельные" палажэнія, вызоў войска, ўжываньне аружжа. Праект кладзе новые агранічэньня на сабраньня, суполкі і ўстанаўліваe дагляд паліціі над грамадзянскім жыцьцём.

### С прычыны обыскоу.

С прычыны уселякіх обыскоў у Пецярбурзе, цягнуць пад суд 772 душ.

### Вучыцельскі зьезд.

Між 1 і 15 чэрвеня у Пецярбурзе адбудзецца зьезд вучыцелёў. Арганізаційная рада звярнулася да міністра ўнутрэнных спраў с просьбай пазволіць дэлегатам зьезду вучыцялём-жыдом на час зьязду жыць у Пецярбурзе.

### Зьезд таварыств дробнаго паверу.

Гэтымі днямі аткрыўся у Пецярбурзе зьезд прэдстаўнікоў дробнаго паверу. На зьезд прыбыло больш 500 душ. Зьезд праслухаў і зацьвердзіў атчот а працы таварыств дробнаго паверу, каторы выясьняе, што сучаснае палітчынае палажэньне дужа дрэнна адбіваецца на паверных інстытуціях. Балканская вайна бадай саўсім зглуміла ўсю карысць гэтагоднай гаспадарскай працы, бо не было нормальнай цаны на зярно.

### Проці Думы.

„Русск. Вѣд." перэсказываюць, як чутку, сэнсаційную навіну, што бытцым прэдставіцелі дваранства каторые былі зьехаўшыся на сьвяты у Маскве, прыгатавалі паданьне аб тым, каб распусьціць Думу, але ў апошнюю мінуту зракліся падаваць яе.

### Маскоускіе сьвяты і дэпутаты.

На маскоўскіе сьвяты запісалося 17 дэпутатоў. Але абзнаёміўшися с цэрэмоніялам сьвятоў, і даведаўшыся, што члены Думы па цэмоніялу ня могуць належаць да Высочайшаго выходу, а будуць мець права стаяць толькі ня пляцу перэд палацам, то больш палавіны іх адмовілося ехаць у Маскву. Між тымі, што адмовіліся, ёсць і такіе дэпутаты, што па прыдворнаму чыну маюць права належаць да Высочайшаго выходу.

### Кіеуская выстаука.

У Кіеві 10 чэрвеня адбудзецца аткрыцьце сельска-гаспадарскай выстаўкі. Сперша гэтая выстаўка мелася быць толькі краявой—украінскай, а пасьля разраслася да меры ўсерасейскай. На аткрыцьце выстаўкі выбіраюцца усе міністры, разам с прадседацелем міністроў Коковцэвым.

### Благанадзежнасць дзяцей.

Па загаду сімбірскаго губэрнатара пэдагогічная рада Якубоўскай дзявочьй гімназіі, пачала вымагаць ад вучэніц, каторые вучацца дома, а толькі экзамены здаюць пры гімназіі, каб яны прэдстаўлялі сьвідзецельствы аб палітычнай благанадзежнасьці. Дзіўна тое, што пры гэтай гімназіі здаюць экзамены дзеўчаткі 12 – 14 гадоў.

### Прадажа дзяцей.

У Віндаві паліція выкрыла невенчаных мужа і жонку, каторые прадавалі сваіх дзяцей. Дзяцей куплялі татары.

### Цікавая находка.

Каля Царыцына каля рэчкі Мечэткі, знайшлі руіны татарскіх будоўлі часоў Батыя і Мамая. На гэтым мейсцы пачалі ужо раскапываць.

---

## Жарты.

* * *

— Пан, пан, лазьня гарыць.

— Цягні карыта, а я зара пульку кончу.

* * *

Маскаля цягнуць у цэркву, а ён крычыць:

— Хоць пайду, але і губай ня мяльну!

* * *

Пабіян Габрэлю пляснуў па мордзі.

— Ты гэта ўзапраўду, ці жартуеш?—пытае Габрэль.

— Узапраўды.

— Хіба, што так, бо я гэткіх жартаў не люблю!

---

## Прыпеукі.

Я на ганку стаю,
Сьлёзы коцюцца,
Дзеўкі замуж ідуць,
І мне хочэцца.

* * *

А мой муж ды ня дуж;
Ляжыць у запечку:
Крэх! вох! каб ён здох,
Паставіла-б сьвечку.

---

Рэдактар-Выдавец
А. Уласоу.

---


## Каму дорага жонка і дзеці

той павінен застрахаваць сваё жыцьцё у «Першым Узаемным Таварыстве страхаваньня жыцьця.

Праўленьне Літоўска-Беларускаго округа:

Патрэбны рупные агенты.

*Вільня, Віленская 33*


Друкарня „Артель Печатнаго Дѣла" Віленская, 25, тэлеф. 199.